# ЗВЯЗДОЎСКІЯ ПРЫЗЫ — ВЕРНЫМ ПАДПІСЧЫКАМ

**Ва ўчарашнім нумары газеты быў надрукаваны анонс аб розыгрышы прызоў сярод падпісчыкаў газеты па выніках падпісной кампаніі на 4-ы квартал 2007 года. Сёння мы паведамляем падрабязнасці гэтай акцыі з друкаваннем спісаў шчасліўчыкаў.**

*Прыемна, што нашы чытачы па-ранейшаму вераць ва ўдачу і дасылаюць у рэдакцыю запоўненыя купоны. Мы ў сваю чаргу і надалей будзем радаваць сваіх прыхільнікаў не толькі змястоўнымі матэрыяламі і інфармацыяй, але і салідным прызавым фондам.*

## Вось як ён размеркаваўся на гэты раз:

◆ **МАЙКА З ФІРМЕННЫМ ЛАГАТЫПАМ «ЗВЯЗДЫ»**

**КОЗЕЛ Тамара Іванаўна,** *г. Ляхавічы, Брэсцкая вобласць*

**КАЖАН Марыя Пахомаўна,** *г. Лепель, Віцебская вобласць*

**ДАНЧАНКА Аляксандра Аляксандраўна**, *в. Лучын, Рагачоўскі раён, Гомельская вобласць*

**АПАНАСІК Валянціна Баляславаўна**, *в. Крупава, Лідскі раён, Гродзенская вобласць*

**ПУШКІН Міхаіл Васільевіч,** *в. Лапічы, Асіповіцкі раён, Магілёўская вобласць*

**КАЗЕЙ Сяргей Астапавіч,** *в. Ніва, Уздзенскі раён, Мінская вобласць*

**БАСІК Павел Ігнатавіч,** *г. Мінск*

◆ **БЕЙСБОЛКА З ФІРМЕННЫМ ЛАГАТЫПАМ «ЗВЯЗДЫ»**

**БАГДАНЕЦ Ганна Іванаўна**, *в. Вулька-1, Лунінецкі раён*

**НАДЗВЕДСКАЯ Яўгенія Іванаўна**, *в. Камаі, Пастаўскі раён, Віцебская вобласць*

**ПРАКАПОВІЧ Антон Барыавіч**, *в. Ленін, Жыткавіцкі раён, Гомельская вобласць*

**АЛЯШКЕВІЧ Алена Георгіеўна**, *в. Самуйлавічы Дольныя, Мастоўскі раён, Гродзенская вобласць*

**ДЗЕНІСЕВІЧ Ларыса Міхайлаўна**, *в. Коўбча, Клічаўскі раён, Магілёўская вобласць*

**ГНЕДЧЫК Вольга Фёдараўна**, *г. Мар'іна Горка, Пухавіцкі раён, Мінская вобласць*

**БАЯРОВІЧ Яўген Васільевіч**, *г. Мінск*

◆ **НАРУЧНЫ ГАДЗІННІК З ФІРМЕННЫМ ЛАГАТЫПАМ «ЗВЯЗДЫ»**

**ДРОЗД Надзея Мікалаеўна**. *г. Ганцавічы, Брэсцкая вобласць*

**ЦЫЎНЕЛЬ Кацярына Адамаўна**, *п/а Дубраўка, Браслаўскі раён Віцебская вобласць*

**ШАРАПАВА Валянціна Іванаўна,** *в. Старая Беліца, Гомельскі раён*

**ШАБЛІНСКАЯ Ядзвіга Каятаўна**, *г.п. Астравец, Гродзенская вобласць*

**ПУГАЧ Марыя Сцяпанаўна,** *в. Ліпніца, Клічаўскі раён*

**СІДАРОВІЧ Уладзімір Уладзіміравіч,** *в. Заастравечча, Клецкі раён Мінская вобласць*

**ФІЛІЧОНАК Ларыса Антонаўна**, *г. Мінск*

◆ **КАЛЯРОВЫ ТЭЛЕВІЗАР «ВІЦЯЗЬ»**

**ТУРКОВА Яўгенія Максімаўна,** *в. Канашы, Гарадоцкі раён, Віцебская вобласць*

◆ **ХАЛАДЗІЛЬНІК «АТЛАНТ»**

**СВІРСКАЯ Галіна Юльянаўна**, *в. Дзенавішкі, Смаргонскі раён, Гродзенская вобласць*

Яшчэ раз віншуем усіх звяздоўскіх лаўрэатаў з удачай. Упэўнены, што ў наступны раз яшчэ ўсміхнецца тым, хто зараз не змог злавіць яе за хвост.

Загадзя просім прабачэння ў тых чытачоў, калі ў прозвішча ці населены пункт укралася недакладнасць, бо не ўсе купоны запоўнены разборліва.

Свае прызы, паважаныя звяздоўцы, можна атрымаць адразу пасля выхаду публікацыі ў свет.

Заставайцеся з намі!

## ЗАМЕСТ ПАСЛЯСЛОЎЯ

...Многія падпісчыкі —, нават са стажам у 50 і болей гадоў — зноў не знайшлі сваіх прозвішчаў у спісе шчасліўчыкаў... Хоць і марылі нешта выйграць, своечасова даслалі карткі...

Паверце — усе яны атрыманы, зарэгістраваны, усе бралі ўдзел у розыгрышы, які і на гэты раз праходзіў, так бы мовіць, празрыста, пры сведках: нашых дзелавых партнёрах, прадстаўніках РУП «Белпошта», якія вядуць падпіску, ну і, зразумела ж, падпісчыкаў-мінчан, якіх запрасілі напярэдадні. На гэты раз (як ужо паведамлялася), імі сталі спадарыня Дуняк, старшы дыспетчар Мінскага механічнага завода імя Вавілава і спадар Кангатаў — электразваршчык Мінскага электратэхнічнага завода імя В.І. Казлова.

Нам прыемна было даведацца: што ў абедзве сям'і «Звязда» прыходзіць не адно дзесяцігоддзе, што муж Ірыны Тадэвушаўны з задавальненнем носіць выйграны звяздоўскі гадзіннік, а Леанід Дзмітрыевіч некалі выйграваў падпіску. Але ж газету яны, як і абсалютная большасць іншых чытачоў, выпісваюць зусім не дзеля прызоў, — для таго, каб мець крыніцу інфармацыі, каб, жывучы ў Беларусі, чытаць па-беларуску.

...Дзякуй усім, хто падпісаўся — у 1-ы раз альбо ў 51-ы — і тым самым падтрымаў найстарэйшую і адзіную ў краіне беларускамоўную газету. Будзем спадзявацца, што вы не пашкадуеце. А вельмі многія яшчэ і выйграюць. Канадскія вучоныя прыйшлі да высновы, што чалавек, які валодае дзвюма мовамі, жыве на чатыры гады даўжэй. Гэта, згадзіцеся, супер-прыз! Калі ж не крыўдзіцца, рэгулярна выпісваць і чытаць «Звязду», дасылаць карткі на розыгрыш, рана ці позна, будуць, дасць Бог, і іншыя.

7 кастрычніка — Дзень настаўніка

# МАЛАДЫМ ПЕДАГОГАМ — КЛЮЧЫ АД НОВЫХ ДАМОЎ!

**Прэс-канферэнцыю, прысвечаную прафесійнаму святу педагогаў, правёў у Нацыянальным прэс—цэнтры намеснік міністра адукацыі Казімір ФАРЫНО.**

Сёння вышэйшую адукацыю маюць ужо 86,9 працэнта школьных настаўнікаў, вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю — 23,4 працэнта школьных педагогаў і 44,5 працэнта — першую катэгорыю. Штогод павышаюць сваю кваліфікацыю каля 50 тысяч — гэта фактычна кожны трэці беларускі педагог.

— Многія прытрымліваюцца той думкі, што да вучэбных перагрузак вядзе складанасць вучэбных праграм і падручнікаў, — паведаміў журналістам Казімір Фарыно. — Аднак сапраўдная прычына хаваецца ў няўменні рацыянальна арганізоўваць вучэбную дзейнасць, калі асноўная нагрузка пераносіцца са школы на хатнюю падрыхтоўку. А гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да празмернай стомленасці дзяцей. Такім чынам, праблема школьных перагрузак — выключна педагагічная праблема. Улічваючы, што інфармацыйнае поле абнаўляецца вельмі імклівымі тэмпамі (толькі за год аб'ём новай інфармацыі павялічваецца ўдвая!) працаваць так, як раней, мы не можам сабе дазволіць.

Нядаўна некаторыя мінскія школы перайшлі на электронныя дзённікі. Электронны дзённік — гэта спецыяльная праграма, якая дае магчымасць бацькам штодзённа атрымліваць інфармацыю аб адзнаках і паводзінах сваіх дзяцей з дапамогай SMS-паведамленняў або праз Інтэрнэт-сайт. «Я цалкам падтрымліваю ўсё, што звязана з аператыўным атрыманнем інфармацыі, — прызнаўся Казімір Фарыно. — Тым больш лічу, што бацькі павінны быць паўнавартаснымі ўдзельнікамі адукацыйнага працэсу».

Не выключана, што і мы ўслед за расійскімі калегамі можам перайсці на вывучэнне ў школе інфарматыкі з больш ранняга ўзросту. Сёння беларускія школьнікі пачынаюць вывучаць гэты прадмет з шостага класа, а раней на яго адводзілася ўсяго два гады ў старшай школе. Аднак асобныя расійскія рэгіёны пачалі ўкараняць інфарматыку ўжо з трэцяга класа.

У наступным навучальным годзе павінен адбыцца масавы пераход старшай ступені рэфармуемай школы на профільнае навучанне. Адметна, што ў адрозненне ад некаторых іншых новаўвядзенняў ідэя прафілізацыі не выклікала ў грамадстве гарачых дыскусій і пратэсту. У Міністэрстве адукацыі спадзяюцца, што прафілізацыя навучання дазволіць задаволіць усе адукацыйныя патрэбы старшакласнікаў з улікам іх інтарэсаў, схільнасцяў і прафесійных намераў.

Сёння ў Беларусі функцыяноўць 3893 агульнаадукацыйныя ўстановы, у тым ліку 165 гімназій, 36 ліцэяў і 6 вучэбна-педагагічных комплексаў «сярэдняя школа (гімназія)-каледж».

— Мы вельмі асцярожна ставімся да пашырэння сеткі навучальных устаноў новага тыпу. І лічым, што фармальная змена шыльды на ўстанове адукацыі недапушчальная, — падкрэсліў Казімір Фарыно. — Для таго, каб адкрылася, скажам, новая гімназія, павінны скласціся пэўныя перадумовы: гэта і наяўнасць падрыхтаванага да работы на новым якасным узроўні кадравага складу, і адпаведная матэрыяльна-тэхнічная база, і жаданне навучэнцаў атрымліваць веды на павышаным ці паглыбленым узроўнях. Сёння мы імкнёмся ствараць аднолькавыя стартавыя ўмовы і для гарадскіх, і для сельскіх школьнікаў, таму і ствараем у сельскай мясцовасці навучальныя ўстановы новага тыпу. Так, у гэтым навучальным годзе для сельскай дзятвы было адкрыта 16 устаноў новага тыпу.

Па выніках размеркавання сёлета ў агульнаадукацыйныя ўстановы было накіравана амаль што 6,4 тысячы выпускнікоў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыяй. Але прыкладна чвэрць маладых спецыялістаў пасля адпрацоўкі належнага тэрміну па размеркаванні ўсё ж такі змяняюць сваё першае месца працы. У рамках Дзяржаўнай праграмы адраджэння беларускай вёскі прадугледжаны сацыяльныя гарантыі для маладых спецыялістаў, якія прыязджаюць працаваць у сельскую мясцовасць. У якасці станоўчага вопыту ў змацаванні маладых спецыялістаў Казімір Фарыно прывёў прыклад Гомельшчыны, дзе добрай традыцыяй стала ўручэнне на жнівеньскай педагагічнай канферэнцыі ключоў ад новых домікаў маладым спецыялістам.

Прыкладна паўгода таму ў Беларусі быў створаны клуб «Хрустальны журавель», членамі якога сталі ўдзельнікі і арганізатары конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў «Настаўнік года». Падлічана, што пачынаючы з 1991 года, калі ў Беларусі адбыўся першы конкурс «Настаўнік года», праз розныя яго этапы прайшлі каля 12 тысяч чалавек.

— Нам вельмі не хацелася б, каб удзел у конкурсе прафесійнага майстэрства стаў аднаразовым мерапрыемствам у жыцці педагога, — прызналася Ірына Клевец, настаўнік біялогіі гімназіі № 4 г. Смаргоні, пераможца рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года—2006». — Мэта нашага клуба — стварэнне ўмоў для развіцця ініцыятывы творчых педагогаў і распаўсюджванне перадавога вопыту на ўсю краіну. Для гэтага савет клуба арганізуе вучэбныя візіты ў школы і прафесійныя «дэсанты» ў рэгіёны. У маі быў выезд у Бярэзінскі раён. Выязджалі падзяліцца сваім вопытам 5 членаў савета клуба, якія за тры дні далі 15 майстар-класаў і правялі 15 адкрытых урокаў. На наступным тыдні «дэсант» з 8 чалавек «высадзіцца» ў Смаргонскім раёне, дзе мы плануем арганізаваць 20 майстар-класаў і даць 20 адкрытых урокаў. Таму запрашаем да супрацоўніцтва ўсе раённыя аддзелы і абласныя ўпраўленні адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**ПАСТАНОВЫ**
**САВЕТА РЭСПУБЛІКІ**
**НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ**
**РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

### Аб дачы згоды на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Дулуб А.С.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з пунктам 2 часткі першай артыкула 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь даць згоду на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Дулуб Алены Сігітасаўны.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Г. НАВІЦКІ**
*2 кастрычніка 2007 года, г. Мінск.*
*№ 485—СРЗ/VIII*

### Аб дачы згоды на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Цысік І.В.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

У адпаведнасці з пунктам 2 часткі першай артыкула 98 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь даць згоду на назначэнне Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь суддзёй Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Цысік Іны Віктараўны.

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Г. НАВІЦКІ**
*2 кастрычніка 2007 года, г. Мінск.*
*№ 486—СРЗ/VIII*

## СЯМЕЙНЫ СКАНДАЛ І... СНАРАД

Напэўна, вельмі здзівіўся ўчастковы інспектар Полацкага РАУС, калі прыбыўшы на месца пасля паведамлення аб сямейным скандале, знайшоў у гаспадарчай пабудове на двары ў беспрацоўнага жыхара вёскі Калектыўная снарад гадоў Вялікай Айчыннай. Устаноўлена, што гэты снарад калібрам 45 міліметраў 41-гадовы беспрацоўны знайшоў летам у лесе ля вёскі .

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ГАНЧАНСКІ І ЖУРАВІНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Найперш Несцярэнка правёў выпрабаванні на сваім агародзе. Паехаў у Ганцавічы, у спецыялізаваную гаспадарку, набыў саджанцы буйнаплодных журавінаў і пасадзіў каля хаты. Калі Аляксей Аляксеевіч сабраў на сваёй сотцы ўраджай, то з'явіліся і зацікаўленыя асобы. Дзесятак вяскоўцаў, гатовыя ўступіць у таварыства і стаць вольнымі сейбітамі журавінаў на падсобных надзелах у клічаўскім балоце. Сярод іх, дарэчы, быў дырэктар і настаўнікі Ганчанскай школы, кіраўнік тоўфапрадпрыемства і саўгаса.

У свае ўчасткі давялося першаадкрывальнікам укласці нямала працы, а таксама грошай. Выпісвалі тэхніку, раўнялі адпрацаваныя тарфяныя палі і на чыстых пляцоўках высаджвалі журавіны.

Набытыя на ўсю кампанію 400 кілаграмаў саджанцаў падзялілі роўна. Маленечкія чаранкі высадзіць на ўчастках у дзесяткі сотак было нялёгка: пальцам у зямлю — пасадзіў і паліў вадой, зноў тыцнуў, пасадзіў і паліў, і яшчэ сотні разоў зноў. Працавалі цэлымі сем'ямі.

— За мінулыя гады нам давялося паваяваць і са спякотай, і з марозам, — расказвае Аляксей Аляксеевіч. — Мы і палолі журавіны, і палівалі з брандспойтаў. Аднойчы былі ўжо зусім рукі апусцілі і амаль кінулі гэты занятак. Але тут нам дапамагла прырода. Зямля зарасла бярэзнікам, і дрэўцы сталі своеасаблівым стабілізатарам — яны абаранілі журавіны ад холаду і сонца. А потым бабры непадалёк пабудавалі плаціну, пайшла вада і ўтварылася звычайнае балота. Тут гаспадары і зразумелі, што штучныя ўмовы на ўзор прамысловых журавінавых плантацый ствараць не трэба — дапаможа сама матухна-прырода.

Калі пайшлі першыя ўраджаі, журавіны больш раздавалі сваякам і частавалі гасцей, чым прадавалі. Рэкламная кампанія дала свае вынікі: буйную ягаду стала набываць на рэалізацыю буйная крама ў Магілёве.

— З продажам у нас была вечная праблема, — прызнаецца Іван Пархамовіч. — Некаторыя нават гавораць, што буйныя журавіны — гэта такія чарнобыльскія мутанты. З-за няведання і падазронасці я вымушаны быў мех сапсаваных журавінаў вясной на агарод высыпаць...

Сёлета першы год, калі спажывецкая кааперацыя без нараканняў набывае ў ганчанскіх плантатараў буйнаплодныя журавіны. Плацяць 4 тысячы за кілаграм. Іван Васільевіч ужо здаў паўтонны і задаволены.

50-гадовы вясковец цвёрда заяўляе, што нікуды не хоча пераязджаць з Ганчанскага. Цяпер ён загадвае гаспадарчай часткай у мясцовай школе, але заробак там невялікі. Пархамовіч свае надзеі ўскладае на журавіны як на сродак павышэння дабрабыту.

Гаспадар горда паказвае ў вазоўні мех ягадаў і важыць яго: 25 кілаграмаў, без малога 100 тысяч рублёў. Добры дадатак да сямейнага бюджэту. Таму невыпадкова, што на ўборку ўраджаю на ўчастак Івана Васільевіча выходзіць уся яго сям'я: жонка, тры сыны, дзве нявесткі, дзеці.

Тут дарэчы адзначыць, што ініцыятарамі стварэння журавінавых плантацый былі якраз мужчыны, а іх цудоўныя палавіны даволі скептычна ставіліся да ідэі і даракалі мужыкоў за марнаванне сілаў і сродкаў. Цяпер жа хваляць за ўпартасць і ахвотна дапамагаюць ва ўсім.

Ягада ў Ганчанскім — экалагічна чыстая. Яна вырошчваецца ў натуральных умовах: ні табе ўгнаенняў, ні хімікатаў. І радыяцыі ў ёй няма: на атрыманых у карыстанне адпрацаваных тарфяніках перш здымалі пласт глебы.

А ручны збор журавінаў забяспечвае добрую захаванасць ягады: непабітыя і непашкоджаныя журавіны захоўваюцца да вясны. Цяпер ягады цвёрдыя, а калі падпадуць пад мароз, то становяцца мяккімі і сакавітымі. Менавіта такія журавіны найбольш прыдатныя для выціскання соку і прыгатавання шмат якіх смачных страў.

— Мы ў сваёй сям'і шмат спажываем журавінаў, таму і не хварэем, — хваліцца Пархамовіч. — Па-першае, мы імкнёмся, каб штодня на стале стаяў журавінавы морс. Робім рознае варэнне: самае смачнае — з журавінавага соку, без ягад. А можна проста журавіны перацерці з цукрам. Дзецям падабаецца. Гэта такая ягада, якая ніколі не надакучвае.

Вельмі часта да плантатараў звяртаюцца сваякі і знаёмыя з просьбай даць журавінаў для хворых. Беларусы традыцыйна карыстаюцца журавінавым морсам, каб падтрымаць сілы арганізма пасля аперацый і цяжкіх хваробаў, збіць высокую тэмпературу, умацаваць імунітэт у дарослых і дзяцей.

Ганчанскія гаспадары ягад для такіх спраў не шкадуюць нікому. Аляксей Аляксеевіч дзеліцца вопытам: на паўтара літра морсу хапае і жменькі сакавітых журавінаў.



— А гурманам для задавальнення прапаную зрабіць наліўку з журавінаў, — усміхаецца ён. — Трэба набраць ягады ў слоік і засыпаць цукрам. Трэба браць мяккія, падмарожаныя журавіны. З цягам часу з іх будзе выдзяляцца сок і змешвацца з цукрам, а пустыя ягады падымуцца ўверх. Атрымаецца светлы сок, цягучы і насычаны, праўда — з невялікім (3—4) градусам. Лыжку ў чай штодня — прафілактыка ўсіх хваробаў!

Журавінаў на ганчанскіх плантацыях з кожным годам становіцца ўсё болей. Так і павінна быць. Цяпер ураджайнасць складае прыкладна 50 кілаграмаў з соткі, а можа быць і 100, і 150, аж да 200 кілаграмаў!

Напрыклад, у Аляксея Аляксеевіча цяпер 70 сотак пад журавінамі. Большая частка дае ўраджай, а на астатніх журавіны падрастаюць. Пакуль са зборам ураджаю, які цяпер завяршаецца, спраўляюцца сваякі, а потым трэба будзе і наймаць людзей.

— Мы мяркуем, што гэтыя журавіны павінны працаваць на пасёлак Ганчанскі, — расказвае пра планы Несцярэнка. — У нас гаспадаркі няма, толькі лясніцтва і торфапрадпрыемства. Так што з працай цяжка. А мы можам стварыць новыя працоўныя месцы. Яшчэ іншыя адпрацаваныя тарфянікі засадзім журавінамі. Калі ў нас умовы і прырода дазваляюць вырашчваць гэтую смачную і карысную для здароўя ягаду, то чаму б гэта не рабіць?

Пакуль яшчэ вялікіх прыбыткаў удзельнікі таварыства, калі шчыра, не бачылі. Атрыманыя ад продажу ўраджаю сродкі выдаткавалі на новыя пасадкі.

**Паводле слоў начальніка ўпраўлення нарыхтовак Магілёўскага аблспажыўсаюза Аляксандра Уткіна, у вобласці цяпер нарыхтавана 86 тон журавінаў.**

**— Гэты год, праўда, зноў не самы ўраджайны на журавіны, — зазначыў Аляксандр. — Як і мінулы. Былі такія часіны, калі мы нарыхтоўвалі па 400 тон. Аднак сёлета перашкодзіла сухое лета, а летась — вялікія восеньскія дажджы, тады яшчэ два чалавекі ў балоце патанулі.**

**Журавіны цяпер прымаюць па 4—5 тысяч за кілаграм. За гэтую ягаду сёння больш плацяць беларускія перапрацоўчыя прадпрыемствы, чым замежныя. Так што сёлета на экспарт пойдзе, у адрозненне ад суніцаў, нязначная частка журавінаў.**

**Журавінны сезон цяпер у самым разгары. Летась, у сувязі з цёплай зімой, народ здаваў журавіны і ў снежні, і ў студзені. Як будзе сёлета — пакажа жыццё і надвор'е. А Аляксандр Уткін запэўніў, што спажывецкая кааперацыя будзе прымае журавіны ад насельніцтва круглы год і штодня.**

Але яны ўпэўненыя, што журавінамі можна зарабіць і сабе на жыццё, і на развіццё пасёлка Ганчанскі. Тым больш, калі б інвестары альбо дзяржава зацікавіліся вопытам вырошчвання буйнаплодных журавінаў на лясных балотах. Але гэта справа будучыні.

А перспектыва ў канкрэтна Ганчанскага таварыства аматараў буйнаплодных журавінаў сапраўды ёсць. Вяскоўцаў запрашаюць заняць вольныя плошчы, каля 3 гектараў у лесе.

— У наша таварыства дарога ўсім адкрыта, — пацвярджае яго лідар. — Калі ёсць ахвота да нас далучыцца, то, калі ласка, зямля ёсць, пасадачны матэрыял дадзім, трэба толькі ўпарта працаваць.

Аляксей Аляксеевіч музыку не кідае: працуе ў школе, займаецца з дзецьмі. Але цяпер расказвае ім не толькі пра Баха і Моцарта, але і пра працу сялян і клічаўскія журавіны. Можа, дзеці вырастуць і будуць развіваць журавінавую вытворчасць?..

Дарэчы, цяпер на агародзе Несцярэнкі праходзяць выпрабаванне буякі альбо, як іх клічуць у народзе, дурніцы. Гэта буйныя, сінія, смачныя ягады. Гаспадар запрасіў гады праз два прыехаць падзівіцца ўжо на плантацыю буякоў.

**Ілона ІВАНОВА.**

*Клічаўскі раён.*

Адкрытае пытанне

# ГМА: ЦІ ЗАСТАЛОСЯ Ў НАС ПРАВА ВЫБАРУ?

**Мы баімся таго, чаго не разумеем. Ставімся да ўсяго невядомага з недаверам. Такая абачлівасць дапамагала першабытнаму чалавеку выжыць. Тым не менш гісторыя неаднаразова даказвала, што далёка не ўсё, што людзі некалі ўспрымалі як варожае і небяспечнае, з'яўлялася такім насамрэч.**

**Сёння спрэчным застаецца пытанне выкарыстання генетычна мадыфікаваных арганізмаў (ГМА). Яшчэ 15 гадоў таму гэта была чыста навуковая праблема. Упершыню дазвол на выкарыстанне трансгеннай расліны ў камерцыйных мэтах быў атрыманы ў 1992 годзе. Далей — больш. З 1996 па 2006-год у ЗША для ўжывання чалавекам у ежу было адабрана 114 відаў ГМ-раслін (соя, кукуруза, цукровыя буракі, рапс, люцэрна, рыс, мускусная дыня, бульба, кабачок, папайя і г.д.) За гэты ж перыяд у Еўрапейскім саюзе «зялёнае святло» атрымалі 20 відаў генетычна мадыфікаваных раслін (соя, рапс, кукуруза і інш.) Зараз ГМ-культуры вырошчваюцца на палях, плошча якіх складае сотню мільёнаў гектараў. ГМ-кампаненты ўваходзяць у многія прадукты харчавання, якія ўжываюць мільёны людзей ва ўсім свеце. І не задумваюцца аб тым, што частка вучоных лічыць ГМА небяспечнымі. Больш за тое, паводле іх сцвярджэнняў, выкарыстанне мадыфікаваных арганізмаў прывядзе да сусветнай катастрофы.**



## СУПРАЦЬ **ГМА**

**Доктар біялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута вышэйшай нервовай дзейнасці і нейрафізіялогіі РАН Ірына ЕРМАКОВА:**

— Апошнія дасягненні ў біятэхналогіі — гэта бясспрэчны прагрэс і прарыў чалавецтва. Сама ідэя транспарціроўкі гена і надання арганізму новых якасцяў вельмі слушная, але трэба здолець рэалізаваць яе на практыцы такім чынам, каб не атрымаць пабочных эфектаў. Той спосаб, які выкарыстоўваецца ва ўсім свеце зараз, мае сур'ёзны дэфект. Падчас распрацоўкі самой тэхналогіі ўбудавання гена была допушчана навуковая памылка, у выніку чаго на свет з'яўляюцца расліны з вельмі нестабільным геномам (геном — сукупнасць генетычнага матэрыялу арганізма. — **Аўт**). Яна праяўляецца ў тым, што чужародныя «ўстаўкі» могуць пранікаць у клеткі органаў тых жывёл і людзей, якія з'ядаюць ГМ-расліны.

Добра разумеючы небяспечнасць ГМА, 828 вучоных з 84 краін падпісалі адкрыты ліст, у якім звярнуліся да ўрадаў усіх дзяржаў з просьбай увесці мараторый на ГМА і прыпыніць выкарыстанне іх у харчовых мэтах. У прыродзе існуе забарона на міжвідавыя скрыжоўванні, калі ж такое здараецца (узгадаем мула ці лашака), адбываецца генетычны збой і такія жывёлы не даюць патомства. Недасканаласць механізму ўбудавання гена пры стварэнні ГМА, нестабільнасць гэтага гена, які можа трапіць у палавыя клеткі, выклікаюць той жа эфект — генетычны збой, што ў перспектыве прывядзе да глабальнага бясплоддзя (ад чалавека да бактэрыі). У Індыі не так даўно назіраўся пік самагубстваў фермераў па прычыне разарэння. Ім прадалі змешанае насенне (трансгенных і нармальных раслін). Два ўраджаі яны сабралі, а трэцяга ўжо не было.

Я правяла сваё даследаванне на пацуках, каб выявіць эфект уздзеяння ГМА на патомства. У якасці сыравіны выкарыстала муку трансгеннай соі, устойлівай да гербіцыду, якую прымяняюць на расійскіх мясакамбінатах. Ужо ў першым пакаленні «соевай» групы назіралася высокая смяротнасць (больш за палову). Каля 40 працэнтаў былі недаразвітымі, з паніжанай вагой. Акрамя таго, усе пацучаняты мелі павышаны ўзровень трывожнасці і агрэсіі. Трэццяга пакалення ўвогуле не нарадзілася. Безумоўна, перад тым, як атрымаць рэгістрацыю і дазвол на выкарыстанне ў ежу, кожная ГМ-культура праходзіла праверку, у тым ліку і ўздзеянне на патомства. Аднак метады гэтых праверак былі неадэкватнымі... Недапрацаванасць тэхналогіі ўбудавання гена можа прывесці да росту анкалогіі, бясплоддзя, алергій, таксікозаў, атлусцення, генетычнай выродлівасці, да знікнення розных відаў жывёл і раслін, пагаршэння стану навакольнага асяроддзя, да змянення клімату і разбурэння біясферы. Даказана, што суіснаванне трансгенных раслін побач з нармальнымі немагчыма: з-за нестабільнасці генома нармальныя расліны становяцца трансгеннымі. Паводле падлікаў вучоных, адлегласць, на якой магчыма распаўсюджванне трансгенных раслін, складае 20 км ад мяжы высадкі. Ачагі забруджвання сёння выяўлены ў многіх краінах свету (ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Новай Зеландыі, Германіі, Японіі і інш.)

## У АБАРОНУ **ГМА**

**Кандыдат біялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Барыс АНОШАНКАЎ:**

— Адным з першых патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да генетычна мадыфікаванага арганізма, — стабільнасць генома і стабільнасць праяў устаўкі. У адваротным выпадку такая расліна не пройдзе ні адну праверку. Прынамсі, праводзяцца яны не фірмамі-вытворцамі, а спецыяльна акрэдытаванымі лабараторыямі.

У 2000 годзе быў прыняты Картахенскі пратакол па біябяспецы да Канвенцыі аб біялагічнай разнастайнасці. У свеце сёння існуе міжнародная сістэма біябяспекі. У справаздачах Сусветнай арганізацыі аховы здароўя і Сусветнай харчовай арганізацыі сказана, што да гэтага часу не выяўлена ніводнага факта адмоўнага ўздзеяння ГМА ні на здароўе чалавека, ні на акаляючае асяроддзе.

Калі, напрыклад, свінню ці карову кормяць дабаўкай з ГМА, іх мяса абавязкова правяраецца на наяўнасць чужароднага гена і бялку. Гэта звычайная практыка.

Гаворачы пра забруджванне ГМ-культурамі, прывяду такі прыклад. Нават калі вы набываеце пакет насення на дачу з паметай «супер-эліта», ва ўсім яго аб'ёме дазваляецца ўтрыманне 0,5 працэнта прымесяў. З ГМА такое недапушчальна. Аднак праблема ў тым, што нават сучасныя камбайны, збожжасховішчы, танкеры-перавозчыкі немагчыма ачысціць да апошняга зярнятка. Прымесі непазбежныя. Адна з вядучых амерыканскіх кампаній распрацавала 10 гатункаў ГМ-рысу (вельмі блізкіх па якасцях). Стварыць адзін новы гатунак каштуе 3—5 млн доляраў, прайсці з ім сістэму біябяспекі — ад 5 да 15 млн доляраў. Зразумела, чаму кампанія выбрала з дзесяці адзін, лепшы, і яго зарэгістравала. Скандал надарыўся, калі ў прадуктах харчавання быў выяўлены незарэгістраваны гатунак ГМ-рысу. Кампаніі давялося аператыўна праводзіць яго праз сістэму біябяспекі і атрымліваць дазвол на выкарыстанне чалавекам у ежу.

Сёння 80 працэнтаў усёй соі, якая вырошчваецца ў свеце, — трансгенная. Больш за 10 гадоў фермеры кормяць ёй жывёлу. Калі б свінні, каровы, куры перасталі даваць патомства, ім бы гэтую сою не давалі. Што датычыцца насення, фірмы-вытворцы маюць права прадаць зерне на адзін ураджай. Самі вы не павінны пакідаць частку атрыманага збожжа на насенне — яно не ўзыдзе. Для гэтага яго спярша трэба апрацаваць спецыяльным растворам, формулу якога ведае толькі фірма.

Калі вырошчваюць ГМ-культуры, устойлівыя да гербіцыдаў, людзі, якія раней займаліся праполкай, губляюць заробак. Гэта сацыяльны аспект. Не заўсёды атрымліваецца прасачыць экалагічны эфект: менш пустазелля (з-за выкарыстання гербіцыдаў) — менш насякомых — менш птушак. Увогуле, мы пакуль што асвоілі першы этап біятэхналогіі: ствараем ГМ-культуры з тымі якасцямі, якія патрэбны сёння фермеру (устойлівасць да гербіцыдаў, да каларадскага жука). Другім этапам будзе стварэнне ГМА з палепшанымі пажыўнымі якасцямі. Трэці плануецца дзесьці з 2035 года, калі мы навучымся рабіць спецыялізаваныя расліны-фабрыкі па вытворчасці біяпаліва, новых валокнаў і г.д.

## *Тайна маркіроўкі*

Паводле слоў Барыса Юр'евіча, біятэхналогія ў Беларусі пакуль развіваецца больш як даследаванне, а не ўкараненне ў практыку. Магчыма, у бліжэйшыя 5 гадоў на нашым рынку з'явяцца расійскія гатункі трансгеннай бульбы. Што датычыцца ГМ-культур заходніх фірмаў, іх пранікненне на Беларусь малаверагоднае (яны ствараюць гатункі ў асноўным для свайго рэгіёна, якія былі б прыдатныя ва Украіне, а ў нас аказаліся б нізкапрадукцыйнымі).

З 2006 года ў нашай краіне дзейнічае Закон «Аб бяспецы генна-інжынернай дзейнасці». Акрамя яго, выкарыстанне прадукцыі з утрыманнем ГМА ці ГМ-кампанентаў рэгламентавана ў Законе «Аб абароне правоў спажыўцоў», Законе «Аб якасці і бяспецы харчовай сыравіны і харчовых прадуктаў для жыцця і здароўя чалавека» і ў шэрагу нарматыўных прававых актаў. З 1998 года ў Беларусі існуе Нацыянальны каардынацыйны цэнтр біябяспекі.

Паводле нацыянальнага заканадаўства, усе прадукты з утрыманнем ГМ-кампанентаў павінны мець адпаведную маркіроўку. Прадукты, у склад якіх уваходзіць соя ці кукуруза, абавязкова праходзяць праверку на наяўнасць ГМ-кампанентаў. «У свеце сёння 102 млн га занята пад трансгенныя расліны, — патлумачыў Барыс Юр'евіч. — З іх 101,9 млн га займаюць соя і кукуруза. Аналіз экспарту паказаў, што ў Беларусь ГМА могуць трапіць толькі ў якасці трансгеннай соі і кукурузы.» Сістэма ГМ-маркіроўкі на Беларусі яшчэ не развіта, таму нярэдкія выпадкі, калі, напрыклад, сталічны хлебазавод дабаўку, у якой быў выяўлены ГМ-кампанент, пускае на корм скаціне. У хлеб яна не ідзе, бо наклеіць на кожны бохан ярлычок — дорага.

Спажывец валодае правам на дакладную і поўную інфармацыю аб прадукце, каб мець магчымасць свядома выбіраць: ужываць ГМА ці не. Прадстаўнікі Мінскага таварыства спажыўцоў правялі рэйд па сталічных магазінах з мэтай адшукаць тавары з маркіроўкай «утрымлівае ГМА». Не знайшлі ніводнага. Затое з тысячы выбраных найменняў прадуктаў у 137 экспертыза выявіла трансгенныя кампаненты. Напрыклад, у расійскіх пельменях ці вяршках, дзе на этыкетцы было пазначана «раслінны бялок». Насамрэч, гэта соя, аднак такі просты манеўр дае магчымасць абмінуць праверку на ГМА, якую абавязкова праходзяць усе прадукты з утрыманнем соі і кукурузы.

Кропка ў спрэчцы аб бяспецы ГМА яшчэ не пастаўлена. Аднак пакуль вучоныя ламаюць коп'і, мы, спажыўцы, самі робім свой выбар — «за» ці «супраць» ГМА. Галоўнае, каб вытворцы пакідалі за намі гэтае права.

**Інга МІНДАЛЁВА.**

**СПІС НЕКАТОРЫХ ПРАДУКТАЎ З ГМ-КАМПАНЕНТАМІ, СКЛАДЗЕНЫ «ГРЫНПІС»:**

**Цукеркі: CADBURY — «Fruit & Nut»; HERSHEY'S — «Kit-Kat», «Symphony»; MARS — «M&M» (усе віды), «Milky Way», «Twix»; NESTLE — «Crunch», «Milk Chocolate». Напоі, дэсерты: NESTLE — «Nesquik»; COCA COLA — «Coca cola», «Sprite»; PEPSI — «Pepsi»; CADBURY — «7Up».**

# Кошт рэпетыцыйнага тэсціравання не змяніўся

Як паведамілі журналісту «Звязды» ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў, кошт удзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні, першы раўнд якога стартуе ў кастрычніку, складзе 16 100 рублёў. На першы раўнд будуць вынесены два варыянты тэстаў па кожнай вучэбнай дысцыпліне, таму пры жаданні абітурыенты змогуць прайсці рэпетыцыйныя выпрабаванні падчас першага тура двойчы.

Другі раўнд рэпетыцынйга тэсціравання пройдзе ў студзені-лютым 2008 года, а трэці — у сакавіку-красавіку. Да пераліку ўстаноў адукацыі, з якімі Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў заключыў дагаворы аб правядзенні на іх базе рэпетыцыйнага тэсціравання (глядзі «Звязду» за 22 верасня. — **Н.Н.**) далучыўся таксама і Інстытут неперарыўнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Варта нагадаць, што для выпускнікоў сталічных агульнаадукацыйных устаноў рэпетыцыйнае тэсціраванне будзе праводзіцца сумесна з Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама на базе школ, гімназій і ліцэяў. Але ніхто не перашкаджае ім узяць удзел у рэпетыцыйным тэсціраванні ў сценах адной з вышэйшых навучальных устаноў — такая «разведка боем» таксама можа аказацца вельмі карыснай.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Інфарм-укол

## Ужыванне ежы як медытацыя

**Не варта забываць, што нават невялікі стрэс пагаршае засваенне ежы. Асноўны гармон стрэсу — картызол. Ён дзейнічае такім чынам, што наша цела становіцца неўспрымальным да рознага кшталту задавальненняў. У стане стрэсу чалавек ужо не адчувае паўнацэннай асалоды ад ежы і, каб яе дасягнуць, пачынае больш есці.**

Свядомае ўжыванне ежы рэгулюе апетыт. Калі вы ясце з веданнем справы, арганізм сам падкажа, у якой колькасці ежы ён мае патрэбу. У нашага мозга з'явіцца час, каб адчуць пах, смак і структуру ежы, зафіксаваць, калі вы набралі дастатковую колькасць харчовых рэчываў і калорый. Калі вы будзеце свядома харчавацца, то хутка адбудзецца адна чароўная рэч — вы пачняце есці мала, але пры гэтым будзеце заўсёды сытымі.

Успрымайце вашу кухню як свяшчэннае месца. Перад гатаваннем ежы запаліце свечку, зрабіце некалькі глыбокіх удыхаў. Калі задумацца, то працэс гатавання і ўжывання ежы — штосьці большае, чым проста задавальненне фізічных патрэб.

7 КРОКАЎ
ДА ЎСВЯДОМЛЕНАЙ ТРАПЕЗЫ:



**1. Сканцэнтравацца.**

Выключыце для сябе ўсе магчымыя выгоды і задавальненні, якія звычайна мы атрымліваем падчас трапезы. Не глядзіце тэлевізар і не чытайце газет. На стале не павінна быць беспарадку. На кухні павінна быць спакойная абстаноўка, якая спрыяе канцэнтрацыі ўвагі.

**2. Не спяшацца.**

Імкніцеся да няхуткага прыёму ежы. Час патрэбны вам для таго, каб канцэнтраваць увагу на дробязях, якія раней не ўяўлялі інтарэсу.

**3. Глыбока дыхаць.**

Рабіце пяць глыбокіх удыхаў перад ежай і ў сярэдзіне трапезы. Глыбокае дыханне дапамагае расслабіцца, падрыхтаваць да работы страўнікава-кішачны тракт і мозг, які, дарэчы, з'яўляецца ключавым органам для перапрацоўкі ежы.

**4. Дзякаваць.**

Да таго як пачаць есці, парадуйцеся бягучаму моманту. Падзякуйце тым людзям і сілам прыроды, без якіх вы не маглі б ужываць дадзеную ежу.

**5. Абудзіць пачуцці.**

Да таго як пачаць есці, паназірайце за ежай, ацаніце яе водар і структуру. Памятайце, тут важна ўсё.

**6. Цаніць дробязі.**

Звярніце ўвагу, як вы трымаеце відэлец, якой музыцы ці размовам аддаяце перавагу, якія эмоцыі ці ўспаміны выклікае тая ці іншая страва.

**7. Пашыраць кругагляд.**

Дадайце штосьці новае ў ваш паўсядзённы працэс прыёму ежы. Напрыклад, замяніце відэлец на кітайскія палачкі. Адкрыйце для сябе новыя рэцэпты, паспрабуйце тое, што раней не каштавалі.

Калі вы зменіце стаўленне да ежы, то пачняце ўважліва выбіраць прадукты і будзеце ўжываць толькі здаровую ежу, атрымаеце намнога больш задавальнення ад ежы, лепей даведаецеся пра сябе і свае магчымасці, не дапусціце пераядання, усвядоміце прынцыпы здаровага харчавання, паспрыяеце лепшаму засваенню ежы і спальванню калорый.

Утерянные бланки страховых полисов Белгосстраха по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств серии АД № 5915713—5915720 считать недействительными.

# ЗЕРНЕ ПАДАЕ НЕ НА КАМЕНЬ...

## Слыннаму беларускаму пісьменніку і, па агульным прызнанні, празаіку еўрапейскага маштабу Івану Пташнікаву — 75

**Ён нарадзіўся ў вёсцы Задроздзе Плешчаніцкага (цяпер Лагойскага) раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў Плешчаніцкую беларускую сярэднюю школу. Працаваў у рэдакцыі плешчаніцкай раённай газеты «Ленінец», настаўнікам Лонваўскай пачатковай школы. У 1957 г. скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Працаваў рэдактарам мастацкай літаратуры Белдзяржвыдавецтва (1957—1958), рэдактарам аддзела прозы часопіса «Маладосць» (1958—1962), а з 1962 па 1995 год — рэдактарам аддзела прозы часопіса «Полымя».**

**Друкавацца Іван Пташнікаў пачаў у 1952 годзе, напачатку былі вершы. Першы празаічны твор — аповесць «Чачык» (1957); першая кніга апавяданняў і аповесцяў — «Зерне падае не на камень» (1959). Яны, а таксама раман «Чакай у далёкіх Грынях» (1960) вызначылі пачатак творчага шляху Пташнікава-празаіка, прыхільнасць да вясковай тэматыкі, веданне штодзённага побыту, звычаяў, псіхалогіі вяскоўцаў, здольнасць паказаць дыялектыку характараў, праўду рэальных абставінаў.**

**Тэма вайны займае ў творчасці Івана Пташнікава асаблівае месца. Трагедыі спаленых разам з людзьмі вёсак, такіх, як Дальва (аповесць «Тартак»), гераічная барацьба партызан і жыхароў акупаванай Беларусі супраць гітлераўскага нашэсця (аповесць «Найдорф»), антываенны пафас многіх апавяданняў сведчаць, што вайна ў Пташнікава свая, перажытая ў дзяцінстве.**

**Раманы гэтага адметнага аўтара «Мсціжы» і «Алімпіяда» — найбольш яркія творы беларускай «вясковай» прозы.**

**Іван Пташнікаў — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа. Многія творы пісьменніка перакладзены на замежныя мовы.**

**Які ён, Іван Пташнікаў?**



### «Апавяданне «Львы» — гэта мой чарнобыльскі боль...»

**Мікола МЯТЛІЦКІ, галоўны рэдактар часопіса «Полымя»:**

— У творчым акіяне прызнанага майстра слова, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа, празаіка Івана Пташнікава ёсць і апавяданне «Львы». Памятаю, які чытацкі рэзананс выклікала апавяданне, званіў аўтару нават Алесь Адамовіч...

А для мяне гэта мой чарнобыльскі боль. Мой Бабчын. Сястра, яе муж і грудныя дзеці, кіеўскі таксіст, а таксама наш Шарык, які стаў Д'жукі. З усімі імі Іван Мікалаевіч сустракаўся ў Бабчыне. Усіх іх, як аказалася, прыняў душой. Пра ўсіх іх напісаў.

Канкрэтыка Чарнобыля пачалася з «Львоў». І таму сягоння, віншуючы слыннага пісьменніка з юбілеем, гавару шчыра: здароўя, натхнення і дабра ў Ваш Высокі Храм Літаратуры, дарагі Іван Мікалаевіч!

Прыміце віншаванне і ад сягонняшніх палымянцаў, часопіса, у якім вы багата гадоў загадвалі прозай.

### Мужыцкі корань

**Сцяпан ЛАЎШУК, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАНБ:**

— Тое, што Іван Пташнікаў на сёння з'яўляецца, бадай, самым сур'ёзным нашым празаікам, — ні для каго не сакрэт.

Мой вопыт знаёмства з творчасцю Пташнікава пачаўся вельмі даўно. Яшчэ са студэнцкіх часоў я зразумеў, што гэта «мой аўтар».

Іван Пташнікаў — адзін з самых тонкіх знаўцаў беларускай мовы.

Помніцца, Андрэй Макаёнак — ён жа быў такі выбуховы, дынамічны, з зусім іншымі падыходамі да творчасці — некалі скардзіўся: «Чытаю-чытаю, так і напрошваецца дынамічны паварот...» А я тады скептычна гаварыў: «Яму не падабаецца ваша манера сюжэтабудовы. Калі ў яго культывацыя на добра падрыхтаванай глебе ідзе ашчадна, парастак за парасткам праглядваецца... А ў вас што — як цягнік па чыгуначным мосце: грукат, дынамізм... І трошкі нават страшна, бо не паспяваеш за развіццём вашай думкі, за вашай дзеяй і г.д.». Макаёнак любіў спрачацца, ён у адказ ухмыляўся і казаў: «Ну, дык няўжо ж ты думаеш, што я не ведаю і не бачу, які гэта магутны мастак»...

Такога магутнага мастака рэдка сустрэнеш не толькі ў беларускай літаратуры, але і ў нашых бліжэйшых суседзяў.

...Кожнае слова мае сваю музыку — пра гэта гаварылі многія. Але я веру, што кожнае слова мае таксама і сваю каляровую рамку. Некалі мы навучымся праз камп'ютар разгадваць гэтыя колеры. На аснове твораў Пташнікава — перакананы! — мы будзем мець найвыдатнейшыя карціны. Таму што гэта рэдкі дар, непаўторная пластыка. У яго прозе ўсё дагледжана.

А які зоркі ў яго погляд!.. Ён жа разгледзіць кожную былінку, кожную травінку. І не «самамэтна» — гэта ўсё ў яго працуе.

Хачу сказаць і пра творчасць Івана Пташнікава апошняга часу. Звычайна мы плачамся, што стала цяжка працаваць пісьменнікам, і значных набыткаў менш, чым раней... Але вазьміце апавяданні Івана Пташнікава!

Калісьці мяне надзвычай уразіла яго апавяданне «Львы». Яшчэ нічога не было пра чарнобыльскую трагедыю — а там настолькі ўсё глыбока і праніклівва...

Вялікая проза!..

А ўзгадайма апавяданне «Пагоня». Гэты загнаны ваўкамі лось у мяне адразу асацыяваўся з вобразам Беларусі, якую заганялі ваўкі несправядлівага гістарычнага часу. Я проста фізічна адчуваў настрой ахвяры...

Такіх твораў — магу гаварыць з поўнай адказнасцю — няшмат ва ўсёй сусветнай літаратуры.

Ведаю, што апошнім часам Іван Мікалаевіч трошкі прыхворвае. Але, думаю, пераадолее ён гэта. Таму што мае магутны корань, мужыцкі корань.

...Апавяданні Пташнікава ўражваюць, нават прыгнятаюць сваім трагізмам. А ён сам — чалавек аптымістычнага погляду, аптымістычнага дару. А як жа ён спявае! Дарэчы, у свой час ён паступаў у тэатральна-мастацкі інстытут, і яго з задавальненнем прымалі туды, казалі: найвыдатнейшая фактура...

Будзем спадзявацца, што з'явяцца новыя творы, і мы будзем з гонарам гаварыць: побач з намі, у наш час жыве такі магутны мастак еўрапейскага і нават сусветнага маштабу.

### НАРОДНЫ ПОГЛЯД

**Таццяна ШАМЯКІНА, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры і культуры БДУ, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі:**

— Беларуская літаратура была заўсёды цесна звязана з вясковым жыццём, можа, менавіта таму пра «вясковую плынь» наша крытыка не гаварыла і не вылучала яе асобна, як у рускай літаратуры. Яна бачылася заканамерным працягам нашай нацыянальнай эстэтычнай традыцыі. Заўсёды неслі моцны сацыяльны і эстэтычны зарад творы на вясковую тэму, строга рэалістычныя, з густой бытавой асновай, з імкненнем да эпічнасці, аднак пры гэтым не пазбаўленыя лірычнага пафасу і драматычнай вастрыні канфліктаў. Літаратура пра вёску развівалася ад сацыяльна-палітычнага аналізу жыцця да спасціжэння сацыяльна-псіхалагічных, духоўных яго асноў. Менавіта ў такім напрамку разгортвалася творчасць аднаго з самых вядомых пісьменнікаў Беларусі Івана Пташнікава — найбольш паслядоўнага прадаўжальніка нацыянальнай празаічнай традыцыі ў сваім пакаленні. Сёння думаецца, што захаванне вёскі на Беларусі — у адрозненне ад амаль поўнага вынішчэння яе ў Расійскай Федэрацыі — заслуга, можа быць, і нашага прыгожага пісьменства.

Стыль І. Пташнікава цяжкаважны, складаны, але складанасць такога тыпу ідзе, відаць, ад таго, што вёску — галоўны аб'ект мастацкага даследавання — пісьменнік і ўспрымае складана: любіць і крытыкуе, захапляецца і нешта адмаўляе. Пташнікаў глядзіць на вёску ўжо з пазіцый гарадскога чалавека, які тым не менш адчувае вясковае жыццё як свой корань і свой пачатак.

У сваіх выдатных аповесцях і раманах — «Лонва», «Тартак», «Найдорф», «Мсціжы», «Алімпіяда», апавяданнях «Алені», «Львы» — І. Пташнікаў імкнецца паказаць нацыянальны беларускі характар у розных яго праяўленнях, пад уплывам самых разнастайных, часам жорсткіх, абставінаў, нярэдка — абставінаў ваеннай пары. Імкненне да паўнаты выяўлення чалавечай індывідуальнасці ідзе нароўні з шырокім ахопам рэчаіснаснай прасторы, у якой жыве герой. Пры гэтым чым багацейшы духоўны свет асобы, тым мацнейшыя і глыбейшыя сувязі яе са светам.

Уражвае мастацкая памяць пісьменніка. Глянуўшы на ўсю яго творчасць, разумееш, што яго мастацкае мысленне пачынаецца менавіта з памяці, з назіральнасці. Пташнікаў зразумеў патрабаванні такога матэрыялу. Ён — пісьменнік-аналітык. Бытавыя падрабязнасці, шматлікія дэталі асяроддзя і ў сувязі з імі тонкія псіхалагічныя імпульсы ў чалавечай душы прыводзяць да больш глыбокага раскрыцця чалавека, а праз яго — і душы народа. Пташнікаў нібы імкнецца даказаць, што быт — толькі абалонка, што жыццёвыя драмы, будзённыя калізіі — толькі першы ўзровень быцця, за якім хаваюцца складаныя духоўныя працэсы.

Народны пункт гледжання на жыццё ў Пташнікава з'явіўся асноўным стылеўтваральным пачаткам. Аўтарская мова натуральна ўбірае ў сябе народную мову. І за кожным словам тоіцца думка, пачуццё, цэлы мастацкі свет пісьменніка, яго ідэйная пазіцыя, эстэтычны ідэал. Нацыянальная насычанасць вобраза ў Пташнікава надзвычай высокая. На ёй грунтуецца ўся мастацкая структура яго твораў.

### Беларускі Фолкнер

**Янка СІПАКОЎ, пісьменнік:**

— Іван Пташнікаў — адзін з найбуйнейшых беларускіх пісьменнікаў XX стагоддзя. Яго творы, народжаныя XX стагоддзем, хораша, па-майстэрску расказалі пра гэты нялёгкі адрэзак часу ў жыцці беларускага народа, былі шчырыя і дакладныя, шукаючы народную сіламоц, якая дапамагла беларусам выжыць у цяжкіх умовах вайны і пасляваенных выпрабаванняў.

Пра гэта сведчаць усе кнігі і ўсе творы слыннага пісьменніка. Яны, даследуючы і спасцігаючы душу беларуса, працуюць і сёння ў нашым, ужо XXI стагоддзі.

А што ж я сам памятаю, што люблю з Івана Пташнікава? І памятаю ўсё, і люблю ўсё напісанае гэтым глыбокім, нават глыбінным талентам.

Пачынаючы з ягонай першай, перапоўненай, здаецца, праз край жывым жыццём, студэнцкай аповесці «Чачык», якую яшчэ ў 1957 годзе надрукаваў часопіс «Полымя» і якою захапляліся не толькі мы, студэнты, яго сябры, але і вельмі паважаныя тады жывыя класікі. Нават у чатырохтоміку выбраных твораў пісьменніка, куды пераборлівы аўтар не ўключыў «Чачыка», мне не хапае менавіта гэтага твора.

Пра першую кнігу Івана Пташнікава «Зерне падае не на камень» пісалі ўжо сур'ёзна вельмі сур'ёзныя крытыкі, часам нібыта апраўдваючыся, што пра кнігу пачаткоўца ім выпадае пісаць як пра набытак майстра.

А як мы, у сваім XX стагоддзі, захапляліся пташнікаўскай «Лонваю» — паэтычнай, з моцнай эмацыянальнай напоўненасцю і ў той жа час з такім роздумам усё пра тое ж складанае жыццё.

А які кранальны трыпціх — апавяданні «Алёшка», «Алені», «Бежанка»! Здаецца, шчырага да здзіўлення пачуцця, якім перапаўняецца душа таго, хто чытае, хопіць усім нам на доўгія стагоддзі — і тым, што жывуць з намі, і тым, хто прыйдзе пасля нас.

«Тартак». Сімвалічны тартак. Лесапілка. Гатар, які рэжа ўсё, што яму падсоўваюць. Абставіны, у якія вайна паставіла беларускі народ і з якога, здавалася б, няма выйсця: туды пойдзеш — заб'юць, сюды пойдзеш — застрэляць. Дальва. Спаленая з людзьмі вёска... У гэтай аповесці пісьменнік узнімаецца да самых вяршыняў чалавечага, сусветнага мыслення.

А яшчэ ж у Івана Пташнікава ёсць «Львы», «Пагоня», «Францужанкі», «Арчыбал», «Тры пуды жыта» — класічныя апавяданні, якімі Пташнікаў закончыў мінулае стагоддзе.

І ёсць «Ненапісаная аповесць», якою Майстар пачаў новае тысячагоддзе.

Высокае месца ў беларускай літаратуры займаюць тры яго важкія раманы — «Чакай у далёкіх Грынях», «Мсціжы» і «Алімпіяда».

Колькі напісана і як напісана!

Яго называюць беларускім Фолкнерам. Шукаюць яму іншых настаўнікаў. А ён заўсёды заставаўся і застаецца толькі Іванам Пташнікавым. Беларускім пісьменнікам. Мудрым летапісцам свайго народа, які хоча спазнаць і разгадаць таямніцу чалавека і яго душы.

З юбілеем цябе, Іван Мікалаевіч! Трымайся, дружа!

**Падрыхтавала Таццяна ПАДАЛЯК.**

---

Забытае? Новае? Вечнае!

# ЦІ ТРЭБА ЖОНЦЫ ПЕРАХОДЗІЦЬ НА ПРОЗВІШЧА МУЖА?

**«Недзе прачытала, што жанчына, якая выходзіць замуж, абавязкова павінна браць прозвішча мужа. А ў тым выпадку, калі шлюб будзе скасаваны, яна павінна ўзяць сваё дзявочае прозвішча. А як быць з дзіцем? Калі я буду мець адно прозвішча, а сын — іншае, то ці не паўплывае гэта на характар нашых узаемаадносінаў?»**

*Наталля КАРАНЕВІЧ, Капыльскі раён.*

Мы прапануем шукаць адказ на пытанне разам, зыходзячы з логікі пабудовы традыцыйных абрадаў, якія суправаджаюць жыццё чалавека. У сям'і нарадзілася дзіцятка. Бабка-павітуха, якая прымала роды, акрамя шэрагу ўласна фізіялагічных працэдур, перавязвання пупавіны, загортвала немаўля ў бацькавы штаны (калі нарадзілася дзяўчынка) або ў матуліну сарочку (калі нараджаўся хлопчык) і клала на сямейны стол, паперад засцяліўшы яго невялічкім кавалачкам палатна або спецыяльным ручніком-спавівачом. Што мог сімвалізаваць гэты просты на першы погляд рытуальны крок? Стол у сялянскай хаце (стаяў у чырвоным куце пад абразамі, у самай сакралізаванай зоне) і прастол у храме — функцыянальна адно і тое ж. У дадзеным выпадку дзіця прадстаўлялі Нябёсам з просьбай надзяліць шчаслівай доляй. З другога боку, загортванне дзіцяці ў бацькоўскае адзенне і патрэба пакласці на стол сімвалізавалі далучэнне нованароджанага да сямейнага ачага, да таго сакральнага месца, за якім сям'я збіралася разам і ў будзённы дзень, і ў святочны. Новага чалавека надзялялі статусам паўнапраўнага дамачадца.

І вось ваша дачка выходзіць замуж. Адразу ж пасля выкупа бацька апаясвае дачку-нявесту спецыяльным ручніком і тройчы па сонцы абводзіць яе вакол СТАЛА, вядзе да парога і ПЕРАДАЕ ў рукі жаніха. Усё — сям'я і стол развіталіся з тым чалавекам, якога некалі «прывязвалі» да роднай хаты. Напрыканцы вяселля ўжо маці маладога выканае адпаведны рытуал далучэння новай гаспадыні да ІХ гаспадаркі: яна павяжа нявестцы сваю хусціну і фартушок. З гэтага часу ты — наша, у нашай сям'і. Такім чынам, у часе шматдзённага абраду вяселля дзяўчына перажыла рытуальнае перанараджэнне ў статусе жанчыны — гаспадыні ў сям'і мужа. Зразумела, што падобныя змены павінны былі зусім лагічна завяршыцца абраннем прозвішча мужа. Зразумела, маладая жанчына пакіне ў сабе, у сваім поўным імені след бацькоўскага роду — імя па бацьку: Васільеўна, Іванаўна, Пятроўна. Аднак у паўсядзённым ужытку імя па бацьку будзе выцеснена імем па мужу: калі ён Платон, то яна Платоніха, ён Лявон, а яна Лявоніха. Усё гэта сведчыць пра тое, што пераход жанчыны пад патранаж мужа павінен быць поўным і завяршыцца зменай прозвішча. У адваротным выпадку маладзіца застанецца без энергетычна-духоўнай апекі роднай сям'і з аднаго боку і не атрымае родавай аховы па лініі мужа — з іншага. Усё гэта можа справакаваць парушэнне энергетычнай гармоніі чалавека і прывядзе да хваробы.

У выпадку скасавання шлюбу мэтазгодна, каб жанчына зноў перапраграмавала сябе на вяртанне пад патранаж сваёй роднай сям'і і вярнула сваё дзявочае прозвішча. Калі мы разважалі аб гэтым са студэнтамі факультэта культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва, то нечакана выплыла, на наш погляд, заканамернае пытанне: калі ў многіх мясцінах Беларусі ўслед за нявестай, якая разам з пасагам адпраўлялася ў дом жаніха, «замывалі» хату, каб назад не вярнулася, то ці існаваў абрад «вымывання» нявесткі з дома мужа? Аказалася, такога абраду не існуе, таму што развод, або скасаванне шлюбу, былі некалі сітуацыяй-выключэннем, настолькі рэдкай з'явай, што яна не стала аб'ектам сямейна-родавай традыцыі.

Што датычыцца прозвішча сына, які застаўся ад першага шлюбу жанчыны, то яно павінна было застацца бацькавым, бо як бы там ні сталася, але ж ён заставаўся прадаўжальнікам роду свайго бацькі. Больш за тое, якраз сын з гэтага часу станавіўся гарантам матулінай раўнавагі, ён гарманізаваў яе адносіны з наваколлем, з соцыумам, патраніраваў над ёй, перасцерагаючы ад розных негатыўных уплываў. У дадзеным выпадку складвалася выключная па сваім напаўненнем сітуацыя: сын выконваў у сям'і ролю бацькі, чым не толькі не парушаў гармонію сямейных узаемаадносінаў, а наадварот, спрыяў іх наладжванню.

У нейкай ступені прамым пацвярджэннем лідарства хлопца быў абрад провадаў маладых да вянца. Калі бацькі былі не ў пары (нехта памёр або яны скасавалі шлюб), то ні адпраўляць да вянца, ні сустракаць маладых перад парогам роднай хаты адна маці не мела права. Гэту ролю звычайна выконвалі пасажоныя бацькі.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

**Яшчэ раз нагадваем: будзем чакаць ад вас не толькі пытанняў, але і разважанняў, цікавых прыкладаў, «гісторый» з вашага (або вашых блізкіх і знаёмых) уласнага жыцця, апісання мясцовых звычаяў і абрадаў, пра якія яшчэ не ўзгадвалася ў перыядычным друку.**

**Тэлефон для кантакту: 292 21 03.**

---

# Выйгрыш ад пройгрышу

Футбол

**Нягледзячы на тое, што футбалісты барысаўскага БАТЭ зноў пацярпелі ад «Вільярэала» (1:4 у гасцях, 0:2 дома) у першым раўндзе Кубка УЕФА, карысць ад гульняў з іспанцамі відавочная.**



Фота БЕЛТА.

Беларускія балельшчыкі пабачылі на свае вочы (зразумела, тыя, хто не спужаўся прыйсці на сталічны стадыён «Дынама» позна ўвечары ў дождж) аднаго з грандаў Еўрапейскага футбола — паўфіналістаў Лігі чэмпіёнаў (2005/2006) і Кубка УЕФА (2003/2004). Нагадаю, што ў першынстве сваёй краіны «Вільярэал» ідзе на другім месцы, уступаючы з невялікім адрывам толькі тытуляванаму мадрыдскаму «Рэалу». Галоўны трэнер БАТЭ Ігар Крыушэнка пасля матча ў адказ прызнаўся, што паядынак з іспанцамі дазволіў яму па-новаму зірнуць на сваіх гульцоў, якія ніколі раней не змагаліся на полі з такой вялікай самааддачай. Нездарма настаўнік гасцей, чылійскі спецыяліст Мануэль Луіс Пелегрыні заўважыў (магчыма, гэта быў жэст дыпламатыі?), што некаторыя беларусы вартыя гуляць у Іспаніі. Яшчэ на перадматчавай прэс-канферэнцыі ён асабліва вылучыў у складзе БАТЭ Філіпенку і Стасевіча і сказаў, што беларусы могуць яго здзівіць. Калі ж пасля другой запар перамогі над барысаўчанамі яго спыталі, чаго ж гаспадарам усё ж такі не хапіла, каб выйграць, Пелегрыні адказаў проста: «Чатырох галоў». У выпрабаванні «Вільярэалам» БАТЭ вынес для сябе некалькі ўрокаў і, магчыма, дзякуючы гэтаму, забяспечыць сабе яшчэ не адну перамогу ў чэмпіянаце Беларусі. У гэтым сезоне яна ўжо амаль у кішэні.

**Ірына ПРЫМАК.**

---

Глядзіце!

# Дакладна на добры настрой

**Хоць афіцыйна новы тэлевізійны сезон ідзе ўжо з верасня, на некаторых каналах навінкі наўмысна «прытрымліваліся», каб стартаваць пазней, калі канкурэнты ўжо выклалі ўсе козыры. Напрыклад, на «ЛАДзе» кропкай адліку можна лічыць 8 кастрычніка — менавіта ў гэты дзень пачынаецца большасць новых — уласных і ліцэнзійных — праектаў.**

Як адзначыў старшыня Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі, сёлета «галоўная прэм'ера сезона — тэлеканал «ЛАД» у комплексе». Кіраўнік канала Сяргей Кухто ўдакладніў: нягледзячы на гонкі за рэйтынгам, павялічыўся аб'ём дзіцячага вяшчання, захаваліся лепшыя праекты культуралагічнага накірунку, утрымліваецца лідарства ў галіне спартыўнага вяшчання. Адзначым толькі самыя цікавыя праекты.

Гонар «ЛАДу» — рэаліці-шоў «Цудоўная сямёрка», спартыўна-забаўляльны праект уласнай вытворчасці. Калі расійскія «зоркі» шоў-бізнэсу ўпарта выступаюць на лёдзе, нават у некалькіх праектах, то беларускім падаравана цудоўная магчымасць — з дапамогай вопытных трэнераў праявіць сябе ў самых розных відах спорту. Першы эпізод, калі сямёра ўдзельнікаў пакарылі трасу ў Лагойску, гледачы ўжо бачылі гэтай вясной, зараз будзе паказаны другі — асваенне воднай гладзі САК «Алімпійскі». Вядучыя тэлеканала «ЛАД» Святлана Панкратава і Алена Бікранёва, артысты Аня Шаркунова, Тарыел Майсурадзе, Венера і Вольга Вайніловіч, а таксама інспектар УДАІ УУС Мінгарвыканкама Станіслаў Салавей прадэманструюць свае поспехі ў сінхронным плаванні. Адзняты трэці эпізод праекта — водныя лыжы, на падыходзе чацвёрты — конны спорт. Як мяркуе аўтар ідэі «Цудоўнай сямёркі» Сяргей Кухто, праект расцягнецца якраз на ўвесь тэлесезон, а далей — хто ведае, можа, будзе і працяг.

Якое ж тэлебачанне абыходзіцца без ток-шоў, калі ўздымаюцца самыя злабадзённыя тэмы, запрашаюцца неадназначныя героі, у студыі віруюць страсці, а тэлефоны распаляюцца ад званкоў гледачоў. Відаць, кіраўніцтва «ЛАДу» ўлічыла і тэндэнцыі, і чаканні гледачоў, і ўласныя схільнасці — у выніку нарадзілася ток-шоў «Страсці па культуры», першы выпуск якога мы ўбачым у лістападзе. Імя вядучага і нават гасцей пакуль што трымаецца ў сакрэце, што да тэм — нас запэўнілі, што яны будуць вострымі. Напрыклад, адзін з выпускаў плануецца прысвяціць праблеме лаянкі і мату ў паўсядзённай лексіцы...

Не сакрэт, што тэлевізар, за выключэннем, бадай, спартыўных трансляцый, глядзяць пераважна жанчыны. Таму і большасць перадач арыентаваная на прыгожую палову чалавецтва. «ЛАД» выпраўляе сітуацыю, як лічыць патрэбным — прапануе беларускім мужчынам глянцавы тэлечасопіс «Казанова» аб сабе і для сябе, любімых.

Перайшоў з СТБ на «ЛАД» вядомы «тэледоктар», зрэшты, ён жа сапраўдны ўрач — доктар Цярэшчанка — а разам з ім трапіў у эфір праект «урачэбныя тайны». Тут нават гаварыць доўга не трэба — праграмы пра здароўе былі, ёсць і будуць актуальнымі.

Псіхалагічныя праблемы разглядае новы праект «ЛАДу» — «Іншыя». Мэта праграмы — раскрыць псіхалогію злачынцаў, растлумачыць гледачам, чаму, трапляючы ў тую ці іншую жыццёвую сітуацыю, адзін чалавек выбірае шлях барацьбы, а другі плыве па цячэнні. Героі праграмы — асуджаныя; экспертамі выступаюць псіхолагі, нарколагі, сэксолагі, прадстаўнікі сілавых структур, якія дадуць кожнаму гледачу магчымасць прааналізаваць уласныя ўчынкі і думкі.

Новым аўтарскім праектам парадуе знаўцаў і аматараў гісторыі роднага краю Алесь Матафонаў. Цыкл «Лабірынты» раскрывае малавядомыя або зусім невядомыя старонкі культуры, міфалогіі, фальклору беларускага народа. «У бясконцым руху гісторыі вельмі многае губляецца, нешта забываецца, пэўныя звесткі скажаюцца. Аднак ніколі не позна распачаць шлях да спазнання таямніц мінуўшчыны», — перакананы Алесь.

Акрамя ўжо вядомай праграмы «Наша пяцёрачка» з Ксюшай Сітнік і Андрэем Кунцом, рыхтуюцца яшчэ два новыя праекты для дзяцей: «Бухта капітанаў»(рэспубліканскае тэлевізійнае спаборніцтва, нешта сярэдняе паміж спартландыяй і «востравам скарбаў») і «Свая кампанія».



**Аўтар праекта «Лабірынты» Алесь МАТАФОНАЎ і вядучая «Проста праграмы» Аксана ВЕЧАР — прадстаўнікі беларускамоўнай часткі «ЛАДу».**

У дадатак да ўласнаручна створаных праграм, канал «ЛАД» набыў мноства рэйтынгавых расійскіх тэлепраектаў. Сярод іх, напрыклад, змаганне з дзіцячымі капрызамі «Няня спяшаецца на дапамогу» з Ангелінай Вовк (па серадах), «Бітва экстрасэнсаў», для якіх прыдумвае неверагодныя выпрабаванні вядучы Міхаіл Парэчанкаў (кожную пятніцу), рэаліці-шоў «Другое жыццё» (па пятніцах), у якім за два тыдні чалавек цалкам мяняе прывычны ўклад і ператвараецца ў кагосьці іншага, калектыўная барацьба з жаночай дэпрэсіяй «Клуб былых жонак» (па пятніцах), вельмі запатрабаваны «Час суда» з Паўлам Астахавым (штодня па буднях) і г.д.

Ледзьве на забыліся адзначыць — на «ЛАД» прыйшлі «Дзве зоркі». Але не тыя, пра якія адразу ўсе падумалі, хоць тут таксама будзе многа музыкі і спеваў. «Дзве зоркі» — 263-серыйны індыйскі серыял, які пачнецца з 14 кастрычніка.

...Што да Першага канала, то сёлета ён саступіў права першынства малодшаму «сабрату», прызначыўшы адкрыццё сезона на сярэдзіну кастрычніка. Але ўжо вядома, што кіраўніцтва тэлеканала вернецца ў эфір на пазіцыі «гуляючых трэнераў»: старшыня БТРК Аляксандр Зімоўскі з 12 кастрычніка будзе весці грамадска-палітычнае ток-шоў «Жорсткая размова», яго намеснік Аляксандр Мартыненка працуе над ток-шоў «Ход у адказ» (стартуе з 15 кастрычніка), гэтаксама ў праграме ўжо ідзе аўтарскі праект Юрыя Азаронка «Мужыкі». Калі хочаце ведаць падрабязнасці — як кажуць, сачыце за праграмай!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

---

## Усміхнёмся!

**У бацькі тры дарослыя дачкі. Увечары звоніць тэлефон. Ён бярэ трубку, адтуль чуецца мужчынскі голас:**

**— Гэта ты, маё жабянятка?**

**— Не, гэта гаспадар сажалкі.**

☺

Учора веласіпедыст наехаў на КаМАЗ. Ад удару аб КаМАЗ веласіпедыст знік у невядомым накірунку.

☺

**У аўтобусе кандуктар на прыпынку крычыць вадзіцелю з задняй пляцоўкі:**

**— Коля! Пачакай трохі, там яшчэ адзін чалавек бяжыць!**

**Праз некалькі секунд:**

**— Коля! Паехалі хутчэй, я яго ведаю — у яго праязны!**

☺

Начальнік пажарнай аховы ўразвалку, рукі ў кішэнях, заходзіць у пакой, дзе звычайна ў чаканні выклікаў сядзіць брыгада, і спакойна кажа:

— Мужыкі, давайце збірайцеся патроху, будынак падатковай гарыць...

☺

**Жаночая логіка: «Такое выдатнае надвор'е, трэба сабе што-небудзь купіць».**

☺

— А чаго галоўны маўчыць?

— Не ведаю. У нас у арміі так: калі генерал маўчыць — значыць або думае, або партрэт.



---

# «Аўтамата» не будзе

**У «Еўрабачанні-2008» Беларусь, Расія і Украіна пачнуць барацьбу з паўфіналаў, нягледзячы на тое, што сёлета прадстаўнікі гэтых краін увайшлі ў фінальную дзесятку і занялі 6-е, 3-е і 2-е месцы адпаведна.**

Справа ў тым, што на пяцідзесятай штогадовай сустрэчы ў Вероне тэлевізійны камітэт Еўрапейскага вяшчальнага саюза вырашыў змяніць фармат правядзення гэтага конкурсу. З 2008 года ўсе краіны-ўдзельніцы будуць падзяляцца на дзве паўфінальныя групы, з якіх па 10 удзельнікаў трапяць у фінал (схема жараб'ёўкі, тэлевізійнай трансляцыі і галасавання ў абодвух паўфіналах яшчэ абмяркоўваюцца). Аўтаматычнымі фіналістамі застаюцца толькі краіны — заснавальніцы «Еўрабачання», так званая «вялікая чацвёрка» — Францыя, Германія, Іспанія і Вялікабрытанія, а таксама краіна-пераможца — у дадзеным выпадку Сербія. Аргкамітэт лічыць, што такі падзел «павялічвае шчырасць спаборніцтваў».

У Белтэлерадыёкампаніі (а гэта адзіны член ЕВС у нашай краіне) рэакцыя на прынятае рашэнне была, па зразумелых прычынах, негатыўная. Але, як падкрэслівае прэс-служба БТРК, «мы зацікаўленыя ў тым, каб праекты, якія транслююцца на нашых каналах, станавіліся больш цікавымі і прыцягальнымі для гледачоў; таму спадзяёмся, што новаўвядзенні ЕВС будуць гэтаму садзейнічаць».

Нагадаем, наступны міжнародны тэлевізійны конкурс «Еўрабачанне» пройдзе ў Бялградзе 22—24 мая. У якім фармаце пройдзе ў Беларусі нацыянальны адбор, пакуль невядома. **Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

---

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Цяльцам час у рамантычнае падарожжа, а Казярогам — выпраўляць свае памылкі



**АВЕН.** Калі ёсць магчымасць, пазбягайце кантактаў з начальствам, бо гэта прыемных момантаў не абяцае. Ваша праніклівасць зараз высокая на зайздрасць усім, так што выкарыстоўвайце гэты стан для таго, каб разабрацца з многімі загадкамі свайго жыцця. Можаце здзівіць сяброў і знаёмых нечаканымі паводзінамі, але гэта толькі прыцягне да вас увагу. Не хапайцеся за тысячу спраў адразу: больш выгадна выбраць штосьці адно і на гэтым засяродзіць усе намаганні.

**ЦЯЛЕЦ.** Цудоўны тыдзень для новых ідэй і смелых праектаў. Незапланаваная цікавая сустрэча можа прывесці да заключэння выгаднага дзелавога пагаднення. Добры час для афармлення дакументаў — толькі з адной умовай: будзьце вельмі ўважлівыя да кожнай літары. У сераду пастарайцеся згладзіць канфліктную сітуацыю — і ваш аўтарытэт узрасце, да вас пачнуць прыслухоўвацца калегі і начальства. У сераду добра было б адправіцца ў рамантычнае падарожжа, якое падорыць незабыўныя падзеі і ўражанні. Чацвер прыдатны для планавання найбліжэйшай будучыні.

**БЛІЗНЯТЫ.** Перад вамі будзе стаяць выбар. Давядзецца вырашаць сур'ёзныя праблемы. Не варта назапашваць крыўды — гэта толькі ўскладніць ваша жыццё. Тады вашы намаганні будуць абавязкова ацэнены. Пацярпіце: напружанасць эмоцый вакол пераменаў на рабоце паступова будзе слабець. Работа ў калектыве прынясе поспех. Вас чакаюць дзелавыя і сяброўскія сустрэчы. Для дасягнення мэты і паспяховых пераменаў на рабоце вам спатрэбіцца дапамога сяброў. Абапірайцеся на вопыт. У чацвер магчымыя паездкі, заключэнне дагавораў. Магчыма, будзе многа папяровых спраў. Удзяліце блізкім людзям больш увагі.

**РАК.** Настае спрыяльны час для пазітыўных зменаў у лёсе. Можа пашанцаваць там, дзе неабходна праявіць ініцыятыву, напорыстасць і рашучасць. Матэрыяльнае становішча пачне стабілізавацца. Але, калі вы дазволіце сабе прайсціся па магазінах ці расходаваць грошы на забавы, беражыце кашалёк ад спакусаў. У выхадныя вас можа наведаць імкненне да ўтульнасці — магчыма, вы нават зоймецеся перабудовай асабістага дома.

**ЛЕЎ.** Ёсць шанц стварыць трывалы падмурак для далейшых дасягненняў у рабоце і творчасці. Поспех будзе базіравацца на вашай пунктуальнасці і стараннасці. Не дазваляйце навакольным маніпуляваць вамі, не ідзіце на бясконцыя кампрамісы. У аўторак будуць удалымі дзелавыя сустрэчы і перамовы. У пятніцу асабліва пільна кантралюйце дзейнасць памочнікаў і калег, прытрымліваючыся правіла «давярай, але правярай». Выхадныя прысвяціце пасіўнаму адпачынку і пастарайцеся аднавіць сілы, якія расходавалі.

**ДЗЕВА.** Тыдзень напоўнены падзеямі: вас чакаюць знаёмствы з новымі людзьмі, сустрэчы і паездкі. Ваш аўтарытэт паступова ўмацуецца, што створыць добрую перспектыву. Будзе шмат рознай цікавай работы. У панядзелак вам, магчыма, давядзецца скарыстацца дапамогай сяброў. У аўторак нечаканы паварот падзей адкрые перад вамі новыя далягляды. У сераду працаздольнасць можа быць на небывалым узроўні. У пятніцу спрыяльныя паездкі, камандзіроўкі і пачатак падарожжа.

**ШАЛІ.** Пажадана заняцца асабістымі справамі. Для гэтага з'явіцца больш сілаў і магчымасцяў, смеласці і рашучасці. Шчасце не за гарамі, трэба проста ў яго паверыць. Будзьце больш актыўнымі — супрацоўнічайце, заключайце здзелкі і саюзы. Але не забывайцеся, што жаданні партнёраў гэтак жа важныя, як і вашы, інакш можа грымнуць скандал. Нядзеля — цудоўны дзень для сузірання і аналітычнай работы.

**СКАРПІЁН.** Будзе шмат работы, прычым не заўсёды цікавай. Не варта спяшацца з пошукамі партнёраў ці заключаць новыя здзелкі. Лёс дасць вам шанц вырашыць многія праблемы, у тым ліку і матэрыяльныя, калі не будзеце пазбягаць адказнасці. На рабоце магчымыя справядлівыя заўвагі ў ваш адрас. Другая палова тыдня абяцае поспех у самых розных пачынаннях. Усё будзе залежаць ад вашай ініцыятывы і творчых здольнасцяў. Няхай не палохае руцінная праца — яна не зойме шмат часу. Адбудзецца пашырэнне вашых магчымасцяў. Вы лічыце сябе знатаком чалавечых душ? Тады магчымыя расчараванні. Прычым ад самых блізкіх людзей. Яны зусім не падобныя на той вобраз, які стварыла ваша ўяўленне. Яны — іншыя, і гэта, на жаль, не заўсёды добра. Пастарайцеся ў суботу не стаць крыніцай канфліктнай сітуацыі.

**СТРАЛЕЦ.** Для ажыццяўлення планаў давядзецца здзейсніць некаторае насілле над сабой. Не падпускайце да сябе ляноту нават на кіламетр, інакш вам з ёй не справіцца. Пастарайцеся развярнуцца тварам да сваіх падсвядомых страхаў, пачніце іх пераадольваць — і вы адчуеце, як становіцца лёгка на душы.

**КАЗЯРОГ.** Мэтанакіраванасць дазволіць паспяхова вырашыць практычна ўсе праблемы, якія будуць узнікаць на працягу тыдня. Так што смела ажыццяўляйце вашы ідэі і задумы: ад слоў — да справы, ад тэорыі — да практыкі. Аднак усё ж не вельмі спяшайцеся з сур'ёзнымі рашэннямі, асабліва ў аўторак і чацвер. У пачатку тыдня вы атрымаеце цудоўную магчымасць паглядзець на сябе з боку. Пастарайцеся яе не згубіць. Аб'ектыўна ўспрымайце канструктыўную крытыку на рабоце і выпраўце свае памылкі. У рэшце рэшт, нічога страшнага ў гэтым няма. У чацвер будзьце больш асцярожнымі пры зносінах з калегамі, пастарайцеся менш расказваць пра сябе. У гэты дзень інтуіцыя і прыродная высакароднасць дапамогуць пазбегнуць праблем.

**ВАДАЛЕЙ.** Не паддавайцеся эмоцыям: іх сіла на гэтым тыдні можа засланіць розум і нашкодзіць справам. Спакой і разважлівасць — вось складнікі вашай удачы. У гэты перыяд поспех спадарожнічае ініцыятарам розных пачынанняў, але пры гэтым не варта ні камандаваць блізкімі, ні высвятляць адносіны з кім бы там ні было. Лепш прыслухацца да парады таго, хто старэйшы і больш вопытны за вас. У панядзелак сканцэнтруйцеся на самым важным, не адцягваючы ўвагу на дробязі. Пад канец тыдня ўзрасце фізічная актыўнасць, больш паспяхова пойдуць справы, якія звязаныя з руціннымі пытаннямі, а таксама асабістымі абставінамі.

**РЫБЫ.** Варта падвесці вынік пражытага і адкрыць для сябе новую старонку ў жыцці. Вас чакаюць новыя перспектывы і магчымасці — важна іх не згубіць. Пастарайцеся не прагаварыцца аб тым патаемным, што ў вас на душы, — гэтым можна падзяліцца толькі з самымі блізкімі людзьмі. Пятніца — адзін з самых цудоўных дзён гэтага нядрэннага ва ўсіх адносінах тыдня. Усміхайцеся з самай раніцы і пастарайцеся заклікаць на дапамогу ўсю магутнасць стваральнай энергіі. Радуйцеся, весяліцеся, святкуйце — не важна, што іменна.

